СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ЖНІЎНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 151 (28261)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Якой будзе лічбавая прастора ЕАЭС**



**Чаму не інвестуюць у кіно**



**Першыя слёзы на Алімпіядзе ў Рыа**

СТАР. 16

# ЛЯСНЫ «МАРАФЕТ»



Фота БЕЛТА.

**Некаторыя раёны Магілёўшчыны значна пацярпелі ад нядаўніх ураганаў, цяпер там, як і ў іншых рэгіёнах краіны, актыўна ліквідуюцца наступствы непагадзі. Вільчыцкае доследнае лясніцтва Магілёўскага лягаса плануе завяршыць гэту работу на працягу месяца. Ад ветру тут пацярпела і падлягае поўнай высечцы 30 га лесу, часткова лес будзе высечаны на плошчы каля 300 га. Майстру на лесасеках Паўлу ГЛУШАКОВУ, прызёру абласных спаборніцтваў па валцы лесу, яго ўменне і спрыт тут якраз спатрэбяцца на практыцы.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вячаслаў ДРАГУН, намеснік міністра гандлю:**

*«У краіне не назіраецца скачка цэн на тавары для школьнікаў напярэдадні новага навучальнага года. У арганізацыях гандлю прадстаўлены шырокі асартымент тавараў для школьнікаў розных узростаў. У рэспубліцы арганізаваны пашыраны продаж тавараў для дзяцей і падлеткаў, працуюць школьныя кірмашы. Гандлёвыя аб'екты прапануюць пакупнікам тавары са зніжкамі, праводзяць розныя акцыі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9662 | ▼ |
| Еўра | 2,1831 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0302 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0792 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

16151

9 771990 763008

■ Напярэдадні

## БЫЦЬ ПЕРШАКЛАСНІКАМ — ЗАДАЧКА НЕ З ЛЁГКІХ

### Што зрабіць, каб дзіця з радасцю бегла ў школу?

**Першага верасня ў беларускія школы прыйдуць каля 110 тысяч першакласнікаў. І хоць для шасцігодак у нашых школах ствараюцца максімальна камфортныя ўмовы, медыкі пераканаными: пачатак школьнага жыцця — гэта магутнейшы стрэс для кожнага дзіцяці. Як сцвярджаюць псіхолагі, для многіх дзяцей, асабліва шасцігодак, сацыяльная адаптацыя ўяўляе істотную праблему, паколькі асоба, здольная падпарадкоўвацца школьнаму рэжыму, засвойваць школьныя нормы паводзінаў і прызнаваць школьныя абавязкі, яшчэ не сфарміравалася.**

Найбольш распаўсюджаная памылка і педагогаў, і бацькоў — меркаваць аб гатоўнасці да школы толькі па ўзроўні інтэлектуальнага развіцця. Многія бацькі імкнуцца навучыць сваё дзіця чытаць, пісаць, музіцыраваць, «азам» замежных моў яшчэ да паступлення ў школу. Гэта самы надзейны спосаб давесці малога да эмацыянальнага і нервовага зрыву... Навучанне чытанню, пісьму, лічэнню — асноўная задача пачатковай школы. І настаўнік зробіць гэта больш прафесійна, чым бацькі. Да таго ж уменне чытаць і пісаць зусім не азначае гатоўнасць да школы. Для першакласніка куды больш важна ўмець граматна пераказваць тэкст, абагульняць, параўноўваць і лагічна разважаць.

Увагу трэба звяртаць на сацыяльную гатоўнасць хлопчыка ці дзяўчынкі да навучання — пад ёй трэба разумець патрэбу дзіцяці ў зносінах з іншымі, яго настрой на працу і супрацоўніцтва і пэўную самастойнасць. Дзіця прыходзіць у школу, дзе яму давядзецца наладжваць узаемадносіны з аднакласнікамі і настаўнікам, таму ўменне прыслухоўвацца да іншых, саступаць і абараняцца будзе для яго зусім не лішнім.

Гатоўнасць да школы — гэта яшчэ і наяўнасць матывацыйнай гатоўнасці, прычым малога павінен прыцягваць не проста знешні бок школьнага жыцця (новенькія ранец, падручнікі, сшыткі), а магчымасць атрымліваць новыя веды. Тут у больш выгадным становішчы аказваюцца малодшыя дзеці ў сям'і, якія, назіраючы за вучобай старэйшых, таксама імкнуцца да школьнага жыцця: ім падабаюцца паважлівыя адносіны членаў сям'і і да працоўнага месца старэйшых брата ці сястры, і да іх школьных абавязкаў.

СТАР. 4

■ Рэпартаж з нагоды

## ДАКРАНУЦЦА ДА «ЗВЯЗДЫ»

Сёння мы адзначаем 99-ы дзень нараджэння нашай любімай газеты. Напярэдадні свята звяздоўцы прайшліся па сталічным праспекце, названым у гонар выдання



Фота Надзеі БУЖАН.

**У пачатку аднаго з самых вядомых савецкіх фільмаў з іроніяй расказваецца стандартная для ўсёй краіны гісторыя ўзнікнення новых мікрараёнаў: тыпавая забудова і шаблонныя назвы вуліц. Але пра праспект, які быў спраектаваны якраз у перыяд выхаду фільма, а зараз лічыцца сэрцам сталічнага мікрараёна Паўднёвы Захад, такога сказаць нельга: больш за 10 гадоў таму ён змяніў распаўсюджаную на тэрыторыі ўсяго былога Савецкага Саюза назву ў гонар газеты «Известия» на арыгінальную, значную менавіта для Беларусі — праспект газеты «Звязда». Цяпер няўдачлівыя падарожнікі больш не рызыкуюць выпадкова апынуцца не ў той кватэры, а ў жыхароў праспекта ёсць магчымасць быць датычнымі да гісторыі найстарэйшага выдання Беларусі. Чым жыве сталічны праспект імя «Звязды», мы даведаліся на імправізаванай экскурсіі.**

СТАР. 13